Агагельды
АЛАНАЗАРАЎ

# Добрае слова

Вершы і казкі





Мінск
«Юнацтва
1994

ББК 84 Тур7
А 45
УДК 896.361-94

Пераклад з туркменскай Р. А. Баравіковай, У. І. Карызны, В. А. Лукшы

Мастак Р. М. Цімохава

Агагельды Алланазаров — известный детский туркменский писатель. Добрыми глазами смотрит он на мир, искренними словами рассказывает про богатство и особенность родной земли, её трудолюбивых людей.

А $\frac{894036100-009}{М307(03)-94}$ 82—94

ISBN 5-7880-0944-8

© А. Аланазараў, 1994
© Пераклад. Р. А. Баравікова, У. І. Карызна, В. А. Лукша, 1994
© Ілюстрацыі. Р. М. Цімохава, 1994



# Я ПЫТАЮСЯ

Я думаю,
Хаця ўжо засынаю:
Чаму дзень светлы,
Ну а ноч сляпая?

Адкуль бабулі з мамамі
Бяруцца?
Спытаеш іх —
Яны ў адказ смяюцца.

Яшчэ адно пытанне
Так трывожыць:
Чаму арол лятае,
Наш асёл — не можа?

Так кожны дзень —
Увечары і ўранні
Снуюць у галаве
Адны пытанні.



## ДАГАНЯЮ ВЕЦЕР

Даганяю вецер,
Любуюся ім:
Ён крануўся рэчкі
Падалом сваім.

Шэпчацца з лістотай
І траву пасе,
Галінку адломіць,
Грушу патрасе.

Баранчыкаў сонных
Спудзіць ля ракі
І лісткі паперы
Кіне ў трыснягі.

Я бягу імкліва
Ветру наўздагон —
Хай пакажа вецер
Ўсё, што знойдзе ён.







## ПАКІНЕ СЛЕД

Ужо разгараецца сонца,
Як печка,
У цень агароджы
Прыбегла авечка:
— Не ўсталі яшчэ?
Уставайце хутчэй:
Ужо на двары
Даўно сонца пячэ.

У каменя, дыні
Нагрэліся спіны,
І жар —
Па-над агароджаю з гліны.
Ад сонца ратунку
Не знойдзеш нідзе.
Адзіны ратунак, сябры,
У вадзе!

...І толькі пад вечар
Астынуць прасторы,
Закоціцца сонца
За сінія горы.
Святло развітальнай
Вячэрняй зары
Зардзееццa ў кавуна
Унутры.





## *ІГРАЙ, МАЯ ДУДАЧКА!*

Іграй, мая дудачка,
Длу-длу-длу,
Залівайся, дудачка,
На лужку.

Разлівайся гукамі
Па расе,
Хай цябе паслухаюць
Кветкі ўсе.

Хай пачуе мама,
Выйдзе на парог:
— Вось ідзе з пакосу
Мой сынок!

Заўтра, мая дудачка,
Ты зайграеш зноў,
А на сёння хопіць,—
Мы прыйшлі дамоў.



## НОЧ

Выпаўзла
Цемень начная
З-за гор,
Выйшла павольна
Ноч на прастор,

Крадзецца
Да берага
    соннай ракі,
Тушыць
    адзін за адным
Аганькі.

Ў цемры не бачна
Лісінай нары,
Хаты прапалі
Да ранняй зары.

Падаюць птушкі
У ноч, як вуглі,
Глытае і дрэвы яна,
І палі.

Ложка ў хаце
Зусім не відаць...
Плюшчацца вочы.
Хочацца спаць.





## РАНІЦА

Святлее за акном.
Яшчэ маўчыць сяло.
Ды пеўні ўжо крычаць:
— Пад'ём! Святло прыйшло!



Ку-ка-кукараку! —
Яны з зарой пяюць.
Хай людзі не праспяць,
Хутчэй хай устаюць.



Вялікай працы шмат
У нашых татаў, мам.
Яны духмяны хлеб
Спячы паспеюць нам

І трактар завядуць,
Дадуць вады ў сады,
Не змогуць дыні спець
Таксама без вады.

Каровам не знайсці
Травы без пастуха —
І ўранку не дадуць
Яны нам малака.

І пеўні пасля сну
Крычаць на ўсё сяло:
— Ку-ка-кукараку!
Пад'ём! Святло прыйшло!

## *ЖАЎРАНАК*



Аднойчы
К сонцу
Жаўранак узняўся —
І сам
Сваёй адвагі
Напужаўся.



«Нашто я, бедны,
К сонейку узвіўся,
Калі спускацца ўніз
Не навучыўся?»



Спалохана
Крыламі замахаў,
Ды — як гэта ні дзіўна —
Ён не ўпаў,

А паміж небам
І зямлёй павіс
І лёгенька
Пасля спусціўся ўніз...

І з таго часу,
Калі поле спіць,
З гняздзечка ён
Да сонейка ляціць
І, як званочак,
Цэлы дзень звініць!..



## *ДАРОЖКА*

Дарожка бяжыць
І бяжыць пада мной:
Імкліва пятляе,
Нясецца стралой.

Дарожка даўно ўжо
Бяжыць і бяжыць.
Я бачу, як хочацца
Ёй адпачыць.



У двор к Маралі
Заляцела дарожка —
Дарожцы пара
Адпачыць хоць бы трошкі!



### ЗІМА БЫВАЕ ТАДЫ...

— Калі мне чакаць зімы? —
Пытаюся голасам звонкім.
Бачна, зіма бывае тады,
Калі людзі носяць валёнкі.

Павінны згубіцца ў снягах
Летнія ўсе сцяжынкі,
І неба павінна да болю ў вачах
Іскрыстыя сыпаць сняжынкі.

Над комінам кожным павінен дым
Слацца ў халоднай сінечы,
І бабуля павінна на ўслоне сваім
Садзіцца бліжэй да печы.
Тады і бывае зіма...



### ДОБРЫ КОНЬ

Жыў-служыў
Прыгожы конь,
Добры конь,
Здаровы конь.

Воз цягнуў ён —
Будзь здароў!
Перавёз ён
Горы дроў.

Вецер выў
Ці лівень ліў —
Зерне ён
Малоць вазіў.

А ў пагодны
Дзень вясны
Браў сабе ён
Выхадны.

У арбу
Дзяцей садзіў —
Хто жадаў
І хто прасіў.

І пакуль у сіле быў
Дужы конь,
Жвавы конь,
У арбе дзяцей вазіў...
Добры конь,
Прыгожы конь.



## *АСЁЛ*

— Ты чаго, асёл, равеш,
Нам спакою не даеш?

— А нашто ты мне прынёс
Ваду, сена і авёс?
Рады ля мяне старацца,
Каб пагнаць мяне на працу?

— Зусім не!



— Не можа быць!
Дык нашто мяне карміць?
Справу маеш да суседзяў?
Хочаш з'ездзіць?

— Не паеду!

— Значыць, ты не маеш спраў?

— Адну толькі: каб маўчаў!
Ты звычайна не равеш,
Калі што-небудзь жуеш!



## *ЗНОЙДЗЕ ЗОРКУ*

*У кожнага чалавека*
*ёсць свая зорка. Хто шукае яе,*
*той знойдзе.*

*(Народная мудрасць)*

На зямлю
Паслаўшы айлоук —
Пастуховую чорную бурку —
З неба вечар спусціўся,
Заглянуў у пячору,
А затым на раўніне
Улёгся,
На пясках,
На такыры,[1]
На лісці —
Далоньках
зялёных.
І адна за адной
Зоркі, нібы вугольчыкі,
З неба ў ціхую рэчку зляцелі.



Вось хлапчына сядзіць,
Углядаецца ў возера прагна
І не можа адвесці вачэй

[1] Такыр — роўная глiнiстая прастора.

Ад бліскучых згараючых зор.
Імя хлопца — Ільяс.
Не, зусім не рыбак ён,
Хоць і кожны ён вечар
Сюды прылятае бягом.

Толькі зоркі мігнуць —
Ім хлапчына ў адказ заміргае.
— Зоркі,— шэпча,— чакаю вас,
Плывіце хутчэй да мяне.
Дастае ён яблык чырвоны: —
Вось вам, бярыце! —
Ды ўсміхаюцца зоркі здалёк
І не хочуць да берага плыць.





Крошкі хлеба кідае Ільяс
Як прынаду —
Можа, зоркі
Трошкі бліжай к яму
падплывуць.
І цяля палахлівае
Не адразу
Да яго падышло,
Калі вотруб'ем
Яго частавалі
І свежай травой.

Але зоркі к яму не плывуць,—
Ну і дзіўныя зоркі!
Застылі на месцы
І толькі мільгаюць ледзь-ледзь.

Вечар зноў надышоў,
І хлапчына рашыў:
Іх, напэўна, ловяць рукамі,—
І ў азёрную прахалоду
Ён імкліва зайшоў.

Толькі зоркі, адна за адной,
Ад яго паўцякалі.
— Зоркі, зоркі, куды вы? —
Крычаў ім Ільяс...
І вярнуўся на бераг:
Рэчка вельмі глыбокая,
А плаваць Ільяс не ўмеў.

Ён плаваць рашыў навучыцца
І да возера не падыходзіў.
Гэтак некалькі дзён
Ён плёскаўся ў ціхім арыку,
Пакуль на вадзе навучыўся трымацца
свабодна



І плаваць без стомы.
— Чуеце, зоркі,—
Шаптаў у вячэрняе неба,—
Не зракуся надзеі сваёй,
Здабуду я вас!..

І зноў,
Калі зоркі пападалі ў рэчку,
Ён на бераг прыйшоў
І ў вячэрняе возера скочыў,
І слізгаў па вадзе,





А зорка ўцякала,
І адна, і другая —
Ўсе зоркі разбегліся хутка.

— Пачакайце,— крычаў ім Ільяс,—
Пагуляйце са мною! —
І ганяўся за імі,
І радасны плаваў, як рыба,
І забыўся пра ўсё...
Стала неба святлець,
Узнялося барвовае сонца,
Зоркі ў возеры недзе падзеліся —
Ці на дне пахаваліся,
Ці паглытала іх рыба.

Зноў хлапчына вярнуўся без зоркі...
Ды я веру ў такую ўпартасць —
Знойдзе ён, дабярэцца,
Ён зможа
Тую зорку знайсці!

Зноў у возеры
Зоркі з'яўляліся,
Зноў ганяўся хлапчына
За імі.



### *МАЕ СЯБРЫ*

Ён заўжды са мной, мой кот,
Я яго люблю.
Мне смятанкі мама дасць,
З ім яе дзялю.

Певень маршырує мой,
Бы ў страі салдат.
Крочу я, шчаслівы, з ім,
Быццам на парад.

Хай гуляе мой шчанюк
Ў мураве лугоў,
Не заблудзіць ён нідзе,
Вернецца дамоў.





Вось і вослік. Стаць хачу
Дзедам я сівым,
Каб праехаць па сяле
Хоць бы раз на ім.

Ла́скавы вярблюдзік мой,
Ён жа вырас так!
Я б яго дамоў прывёў,
Ды, скажыце, як?

Маё добрае ягня,
Мілае Мэмэ,
Есці сто разоў на дзень
Просіць у мяне.

Толькі жарабя адно
Не даецца мне.
Можа, ноччу я на ім
Праскачу у сне.



## ЛІЧЫЛКА ТРАІХ КАЦЯНЯТ



Шэры кот,
Лянівы кот,
Кіпці вострыць
У паход.

А ў паходзе
Дзіўным гэтым
Будзеш мерзнуць
Нават летам.

Кот
Вачыма заварочаў —
Апранацца
Кот не хоча.

Апраналі
Мы ката
Ад вушэй
І да хваста.

Падабралі
Хутка майку,
Сшылі
Ватнюю фуфайку.





І кату мы,
Як умелі,
Шапку цёплую
Надзелі.

У той шапцы
Кот наш дробны
Быў на чучала
Падобны.

Ды як пойдзе
У паход,
Не замерзне
Шэры кот!

## АБУРАНАЯ ВАРОНА

Я не горш
За птушак іншых:
З белага яечка
Выйшла,
Быць павінна белай,
Добра знаю,
А чаму ж я
Чорная такая?



## *ТРЫ ВУСАТЫЯ КАПІТАНЫ*

***Казка***

Вокны сінія завешаны,
І стаіць у цемры дом.
— Мама, казку! — просяць весела
Кацяняты перад сном.

Аднаго завуць Хаматам,
А другіх — Юсуп, Азіз.
Не жадаюць кацяняты
Адклікацца на кіс-кіс.

Ды да раніцы гатовы
Грэцца казачным цяплом —
Не прапусцяць нават слова,
Не паварухнуць хвастом.

Ў казках — бітвы, ў казках — воі,—
Хто харобры самы з іх?
І каты у тых героях
Пазнаюць сябе саміх...

Дагараюць дровы ў печы,
І ў вуголлі — шмат красы.
А яны ляцяць на сечу
Цераз горы і лясы.

І надзеўшы там шаломы,
Кацяняты ў бой ідуць —
І драпежныя галовы
Цуды-юды з плеч лятуць!..



Казка словам лашчыць вуха
Ад святых дзіцячых дзён.
Казку люба-міла слухаць,
І не хмарыць вочы сон.

Ў казках — бітвы, ў казках — воі,—
Хто харобры самы з іх?
І каты у тых героях
Пазнаюць сябе саміх...



## *ДОБРЫ ЛЕС*
## *І ЗЛЫ ПІЛЬБАСАН*

***Казка***

Лес расхінуўся
На абшарах,
Як мудры волат,
Як герой.
Над ім
То праплывалі хмары,
То сонца
Ў высі залатой.
Там дрэвы гонкія
Спявалі,
Вялі зялёны
Карагод,
Вясёлкай ветлівай
Віталі
Вясны даверлівай
Прыход.
Трывожыў вожык
Неруш кволы,
Ліс порсткі
Разганяў туман,
І суслік,
Быццам археолаг
Капаў закінуты
Курган.
Маглі б у лесе
Заблудзіцца
Пад шатамі
І мы з табой.
Ласю-маруду
І сініцы
Лес харч даваў
І вадапой...

Жыў калісьці
Пільбасан,
Пра яго вы
І не чулі,—
Па другіх блукаў
Лясах,
Ды
Сюды
Шляхі вярнулі.
Ён вялізны
Шасціногі,
Вока —
Быццам бы ранет,
Падцікуе
Ля дарогі,
І адразу
Праглыне.
Днём і ноччу
Сеяў страх,





З невымернай
Лютай злосцю
Сотні знішчыў
Чарапах,
Усіх ахвяр
Патрушчыў косці.
Толькі джала
Ён пакажа,
Ўсё вакол яго
Паляжа.
Доўгі выцягне
Язык —
Чуецца
Страшэнны крык.
Нават тыгра
Пільбасан
Браў за карак,
Нібы котку.
Ён звярам
Хваліўся сам:
Пакладзе слана
За глотку.
Для яго арол,
Што муха,
Ён з таптыгіным,
Як зух —
Схопіць мішаньку
За вуха
І крычыць:
— Здымай кажух!

Там,
Дзе ён —
І жах,
І боль.
Не ўратуешся ты,
Дзе там!
Ён даводзіць:
— Я — кароль
Усіх звяроў
Усёй планеты.

Урэшце
лес вячысты
Сам
Ад яго цярпеў
Багата.
Гнуў асіны
Пільбасан,
Кедры трушчыў
Зухавата.
Выдраў велічны



Арэх,
Дрэва выкінуў
За рэчку,—
Спадзяваўся:
Гэткі грэх
Дараваны будзе
Вечна.
Ён вярбу
Давёў да слёз,
І завуць яе
Плакучай...

Паляўнічы
Дзед Мароз
Лес наведаў,
Лес дрымучы.
Ён над дрэвамі
Кружыў —
Выпраўляў у шлях
Завеі.
Ён сняжынак
Напусціў
Беленькіх,
Нібы лілеі...

Добры лес
Дарыў цяпло
Ўсім сябрам
Чацвераногім.
Для вавёрачкі —
Дупло,
Касалапаму —
Бярлогу.
Ён жуку,
І мураўю,
І лісіцам,
І касулям
Бурку
Падарыў сваю,
Каб яны
Пад ёй заснулі.

У лес памкнуўся
Пільбасан,
Ды прамовіў клён:
— Даволі!
Ты нас мучыў,
Грыз,
Кусаў,
Каб не стрэць цябе
Ніколі!..

Сталі моцнымі,
Як меч,



На марозе елкі,
Сосны:
— Пільбасан —
зладзюга —
Прэч!
Нацярпеліся мы,
Досыць!..

Дрэвы шчыльнаю
Сцяной
Узняліся
Над ракою —
Пільбасан
Ані нагой
У царства дружнае
Лясное.

Клапатлівы
Дзед Мароз
Пільбасана
Ўзяў за карак,
Над сумётамі
Растрос —
Злодзею
Такая кара!

У адно імгненне
Знік
Вораг
Усяго жывога,
Больш не чуцен
Грозны крык,
Песняй лес
Зайшоўся новай...

Лес вясною
Апранаўся
Зноўку
Ў казачны убор.
Ад зладзюгі
Там застаўся
Толькі
Камень
З дзікіх гор.



## ЗМЕСТ

Я пытаюся. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 3
Даганяю вецер. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 4
Пакіне след. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 5
Іграй, мая дудачка! *Пераклад Раісы Баравіковай* — 7
Ноч. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 8
Раніца. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 9
Жаўранак. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 10
Дарожка. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 11
Зіма бывае тады... *Пераклад Раісы Баравіковай* — 12
Добры конь. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 13
Асёл. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 14
Знойдзе зорку. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 15
Мае сябры. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 20
Лічылка траіх кацянят. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 22
Абураная варона. *Пераклад Уладзіміра Карызны* — 23
Тры вусатыя капітаны. *Казка. Пераклад Уладзіміра Карызны* 24
Добры лес і злы Пільбасан. *Казка. Пераклад Валянціна Лукшы* — 26